УДК 37

Т.П. Дапіра

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск

# АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА, АДУКАЦЫЙНЫ АСЯРОДАК І АДУКАЦЫЙНАЯ ЗАДАЧА: ПЫТАННІ АДПАВЕДНАСЦІ

Пытанні адукацыйнай прасторы з'яўляюцца актульнымі для сучасных педагогікі і навукі ўвогуле, бо само паняцце адукацыйнай прасторы з'яўляецца міждысцыплінарным. Французскі сацыёлаг Бурдзьё ўводзіў яго пры вызначэнні сацыяльнай прасторы, зыходзячы з аналогій з прасторай фізічнай. Сапраўды, адукацыйная прастора — прастора сацыяльная. Таму паводле А.А Папова навучэнец — не дзіця, а суб'ект на тэрыторыі дарослых спроб і спраў, сталення [1]. Вылучаюць адукацыйныя прасторы па тэрытарыяльным прынцыпе: міжнародная, еўрапейская, нацыянальная, рэгіянальная, адукацыйная прастора ўстановы адукацыі.

Адукацыйная прастора ўзаемазвязана з адукацыйнай праграмай, якая рэалізуецца ў пэўных часавых межах. Напрыклад, інтэнсіўна-модульна на працягу года. Уся адукацыйная праграма і ўвесь адукацыйны модуль разглядаюцца ў цэласнасці вырашэння адукацыйнай задачы, пастаўленай у пачатку. Такім чынам, адукацыйная задача — гэта кіруючая задача. Яна павінна фармулявацца так, каб матывацыйна закранаць жыццёвыя перспектывы навучэнца.

Таму мы разглядаем заяўленую праблематыку, зыходзячы з наступнай паслядоўнасці:

- адукацыйная задача – адзінка адукацыйнай прагарамы,
- адукацыйная праграма – ядро адукацыйнай прасторы,
- адукацыйная прастора задае сістэму сацыяльных стасункаў.

Звычайна існуючыя адукацыйныя асяродкі маюць лінейны характар. Гэта тлумачыцца найперш адсутнасцю ўнутраных механізмаў, матывацый, што вымушаюць і пабуджаюць да арганізацыі пэўнай адукацыйнай справы ў аднолькавай ступені і выкладчыкаў, і навучэнцаў. Але ці магчыма пабудова сістэм, адукацыйных праграм, якія б спалучалі, накшталт магнітаў, першых і другіх дзеля выканання тых ці іншых адукацыйных дзеянняў?

Так, магчыма. Але пры гэтым неабходна вылучаць кампаненты адукацыйнай прасторы, якія сапраўды працуюць на выкананне адукацыйнай задачы, сярод кампанентаў, што працуюць на яе апасродкавана ці не працуюць увогуле. Гэта значыць прысутнічаюць у адукацыйнай прасторы па традыцыі ці апраўдваюць сваю прысутнасць імітацыяй выканання адукацыйных праграм.

Паводле М.Палані, ”не ўсё тое, што навокал…, з'яўляецца сапраўды асяродкам

развіцця. На гэты працэс уплываюць толькі тыя ўмовы, з якімі асоба ўступае ў тую ці іншую сапраўдную сувязь“[2]. У гэтым выпадку кожны стварае асабістую адукацыйную прастору як прастору ўваходжання ў культуру ў адпаведнасці са сваімі індывідуальнымі асаблівасцямі, што ўздзейнічае на развіццё індывіда праз дзейнасць.

Магчымасці, умовы, спосабы дзейнасці, адносіны, уласцівыя пэўнай адукацыйнай прасторы, якія рэалізуе навучэнец ў выніку засваення культуры цераз асабісты рэфлексійны вопыт, становяцца параметрамі новага рэфлексійнага асяродку. Такім чынам, рэфлексійны адукацыйны асяродак — гэта найперш прастора свабоды. Ён дазваляе назапашаныя метады класічнай адукацыі творча пераносіць на канкрэтную сітуацыю, калі чужыя методыкі набываюць асобасныя рысы суб’екта, становяцца яго сутнасцю і арыентуюць навучэнца[3].

Адукацыйная прастора з’яўляецца важнай псіхалагічнай умовай для вырашэння ўсіх аспектаў адукацыйнай задачы, гэта значыць не толькі набыцця асобай ведаў, уменняў і навыкаў, але і развіцця імкнення да самаўдасканалення і самарэалізацыі. Яна таксама галіна сумеснай дзейнасці суб’ектаў адукацыі, дзе паміж імі і элементамі адукацыйных сістэм выбудоўваюцца пэўныя сувязі і адносіны, што забяспечваюць рэалізацыю ўласных і сацыяльных мэтаў адукацыі.

У дадзеным кантэксце самарэалізацыя асобы — актыўны працэс планавання асобай уласнага жыцця, пошуку ўнутранага ўдасканалення, набыцця новых ведаў, уменняў і навыкаў, дасягнення новых мэтаў, рэалізацыі ўласнага Я і суб’ектнай пазіцыі. Імкненне да самасцвярджэння і самарэалізацыі асобы фарміруецца на этапе прафесіяналізацыі. Таму выбар установы адукацыі і, адпаведна, спецыяльнасці — гэта выбар, па сутнасці, адукацыйнай прасторы. Калі яна чужая, значыць і спецыяльнасць будзе чужой[4].

Пры адэкватным выбары ўстановы адукацыі і спецыяльнасці адукацыйная прастора будзе спрыяць асобаснай і прафесійнай самарэалізацыі. Першая праяўляецца ў сацыяльна-камунікатыўнай сферы, назапашванні ўменняў і навыкаў зносін, у развіцці творчага патэнцыялу ў розных відах дзейнасці, фактычна ва ўменні ўзяць максімум у адукацыйнай прасторы. Прафесійная самарэалізацыя – найбольш высокі узровень самарэалізацыі і, як правіла, выяўляецца ў імкненні навучэнцаў да развіцця творчага патэнцыялу ў прафесіі, пошуку новых ведаў, рэалізацыі даследчых функцый, імкнення пачаць працу як мага раней і ўдасканальваць свой прафесіяналізм. Фактычна гэта здольнасць знайсці сябе спачатку ў адукацыйнай прасторы, а потым і ў прафесійнай.

Паводле К.І. Маслава адукацыйная прастора — сістэма ўплываў і ўмоў фарміравання асобы па зададзенаму ўзору, магчымасцяў для яе ўласнага развіцця, што ўтрымліваюцца ў сацыяльным і прасторава-прадметным асяроддзі. Яна мае складаны сістэмна-структурны характар і прадугледжвае наяўнасць прадметна-матэрыяльнай, дыдактычнай, арганізацыйна-

выхаваўчай, даследчыцкай, інфармацыйнай, сацыяльна-камунікатыўнай структур. Важным паказальнікам ёсць накіраванасць развіцця адукацыйнай прасторы па вектару — адкрытасць — закрытасць; дынамічнасць — статычнасць. Адкрытая і дынамічная — фарміруе найперш каштоўнасці, заснаваныя на пазітыўнай грамадзянскай ідэнтычнасці. Закрытая і статычная — фарміруе ўстаноўкі на пазітыўную грамадзянскую адпатацыю і стабільнасць[5].

Таму адукацыйная прастора павінна мець такія рэсурсныя ўмовы, якія б адпавядалі і спрыялі рэалізацыі адукацыйнай задачы і педагагічнай стратэгіі ўстановы адукацыі ў цэлым. Неабходна вызначыцца, якую асобу павінна фармаваць сістэма адукацыі? Магчыма, для пэўных грамадскіх фармацый галоўнае, каб асоба пазітыўна адаптавалася ў грамадстве, а характар яе паводзін і ўчынкаў прадукаваў найперш стабільнасць існага. Але, ці ёсць у такой пазіцыі месца для далейшага развіцця і ўдасканалення грамадства? Мяркую, што далёка не заўсёды. Таму для сучаснага свету актуальнай з’яўляецца адкрытая і дынамічная адукацыйная прастора, якая мусіць спрыяць пазітыўнай грамадзянскай ідэнтычнасці асобы, здольнай як да ўласнага самаразвіцця і самаўдасканалення, так і да працы дзеля далейшага развіцця і ўдасканалення грамадства.

Ідэнтычнасць абумоўлівае здольнасць асобы да асіміляцыі асобаснага і сацыяльнага вопыту, уласнай цэльнасці і суб’ектнасці ў падуладным зменам знешнім свеце. Э. Эрыксан разглядае працэс фармавання ідэнтычнасці ва ўмовах сацыяльнага ўзаемадзеяння, бо ”... фармаванне ідэнтычнасці прадугледжвае працэс адначасовага адлюстравання і назірання,... дзякуючы якому індывід ацэньвае сябе з пункту гледжання таго, як іншыя, па яго меркаванні, ацэньваюць яго ў параўнанні з сабой і ў рамках значнай для іх тыпалогіі; у той жа час ён ацэньвае іх думку пра сябе з пункту гледжання таго, як ён успрымае сябе ў параўнанні з імі і з тыпамі, значнымі для яго“[6]. Больш за тое, Э. Эрыксан вызначае ідэнтычнасць яшчэ і як форму асобаснага быцця, што ў ідэале інтэгруе на суб’ектыўным узроўні ўнутраны свет чалавека і свет знешні ў адзіны псіхасацыяльны сусвет.

Такім чынам, адпаведнасць адукацыйнай прасторы адукацыйным задачам – адна з найбольш актуальных праблем сучаснай адукацыі. Дынаміка змяненняў адукацыйных задач прадугледжвае адпаведныя змены і ў адукацыйнай прасторы. Падпарадкаванасць напаўнення адукацыйнага асяродку тым адукацыйным задачам, якія ставіць грамадства перад сістэмай адукацыі ўвогуле і адпаведнымі ўстановамі адукацыі ў прыватнасці, яскрава характарызуе яго залежнасць ад прасторава-часавых, сацыяльна-культурных, дзейнасных, камунікатыўных, інфармацыйных і іншых фактараў, якія паўстаюць як умовы ўзаемадзеяння асобы і аб’ектыўнага свету адукацыі, што мэтанакіравана створаны ці спантанна ўзніклі. А.І. Арцюхіна справядліва разглядае педагагічны феномен адукацыйнага асяродку як кантынуум гэтых фактараў, які з’яўляецца неабходным кампанентам цэласнага механізму

прафесійнай сацыялізацыі, крыніцай калізій, жыццёва-прафесійных сітуацый, якія забяспечваюць уваходжанне студэнтаў у лад жыцця, мыслення і прафесійных паводзін спецыяліста[7].

Паняцці адукацыйнай прасторы і адукацыйнага асяродку паводле Е.А. Ракіцінай і В.Ю. Лысковай блізкія, але несінанімічныя[8]. Разглядаючы прастору, даследчыцы маюць на ўвазе набор пэўным чынам спалучаных між сабой умоў, якія могуць аказваць уплыў на асобу. Не прадугледжваецца ўключанасць асобы ў прастору, якая можа існаваць незалежна ад яе.

Паняцце ”асяродак“ адлюстроўвае ўзаемасувязь умоў, што забяспечваюць развіццё чалавека. У гэтым выпадку маецца на ўвазе яго прысутнасць у асяродку, узаемаўплыў, узаемадзеянне асяроддзя з суб’ектам. Дадзеныя тэрміны прыдатныя і для характарыстыкі паняццяў ”адукацыйная прастора“ і ”адукацыйны асяродак“. У адрозненне ад адукацыйнага асяродку адукацыйная прастора ў шырокім сэнсе разглядаецца як сукупнасць адукацыйных інстытутаў, адукацыйных працэсаў і адукацыйных асяродкаў. Агульнае разуменне прасторы звязана з парадкам размяшчэння (узаемнага размяшчэння) адначасова суісных суб’ектаў.

Адукацыйны асяродак — цэласнасць, што мае тры структурныя ўзроўні арганізацыі:

як дынамічная цэласнасць, што інтэгруе ўзаемадзеянні прасторавых адносін архітэктурнага, матэрыяльна-тэхнічнага, сацыякультурнага (гуманітарнага), інфармацыйнага, педагагічнага асяродкаў;

як сукупнасць выбудаваных па канцэнтрычным прынцыпе кампанентаў: адукацыйны асяродак кафедры, факультэта, асяродак навучання курса, групы і г.д.;

як духоўная агульнасць, што ўзнікае ў міжсуб’ектным узаемадзеянні і садзейнічае прафесійна-асобаснаму станаўленню будучага спецыяліста. Своеасаблівым стрыжнем адукацыйнага асяродку з’яўляюцца каштоўнасная агульнасць і традыцыі ўстановы адукацыі[9].

Узаемадзеянне адукацыйнай прасторы і адукацыйнага асяродку — гэта найперш пытанне спалучэння агульнага з прыватным. Адукацыйная прастора, як правіла, праектуецца і ствараецца на ўзроўні свету, кантыненту, дзяржавы, рэгіёна, установы. У сваю чаргу ўзровень адукацыйнага асяродку больш лакальны — установа адукацыі, факультэт, кафедра.

Тэхналогія працы кафедры па праектаванні і стварэнні адукацыйнага асяродку, як сістэмы ўмоў прафесійна-асобаснага развіцця і самаразвіцця студэнтаў, уключае два стратэгічныя кірункі — развіццё структуры асяродку, што дазваляе студэнту рэалізоўваць сваю індывідуальнасць, і выхаванне асяродкаактыўнай пазіцыі самога студэнта.

Якаснае спалучэнне магчымасцяў адукацыйнай прасторы і адукацыйнага асяродку працуе на вырашэнне такіх адукацыйных задач, як фарміраванне ў навучэнцаў пачуцця прыналежнасці да духоўна-прафесійнай агульнасці ўстановы, уключэнне студэнтаў у творчую лабараторыю выкладчыка, культываванне атмасферы цьютарства, суправаджэння і

падтрымкі студэнтаў пры высокім узроўні патрабавальнасці і адпаведнай кампетэнтнасці выкладчыкаў.

---

[1] Попов А.А. Образовательное пространство: социология и технология конструирования. [Электронный ресурс] // http://www.fondgp.ru/lib/mmk/50 (дата обращения: 01.02.2011)
[2] Полани М. Личностное знание. М., 1985. С. 58
[3] Ильязова Л.М., Соколова Л.Б. На пути к рефлексивной образовательной среде вуза. [Электронный ресурс] // http://credonew.ru/content/view/464/30/ (дата обращения: 01.02.2011)
[4] Лидак Л.В., Гущина Е.В. Влияние развивающей образовательной среды вуза на динамику самореализации студента. [Электронный ресурс] // Медицинская психология в России: электрон. науч. журн. 2010. N 3. URL: http://www.ppip.su/arhiv_gl/2010_3/nomer/nom02.php (дата обращения: 01.02.2011)
[5] Маслов К.И. Образовательная среда вуза как фактор развития гражданской позиции студента. Автореферат – Краснодар, КубГУ – 2008, 25 с., с. 10.
[6] Эриксон Э. Идентичность: юность и кризис. М., 1996. С. 32.
[7] Артюхина А.И. Образовательная среда высшего учебного заведения как педагогический феномен. Автореферат – Волгоград, ВГПУ – 2007, 40 с., с. 11-12.
[8] Ракитина Е.А. Информационные поля в учебной деятельности / Е.А. Ракитина, В.Ю. Лыскова // Информатика и образование. – 1999. – №1.
[9] Артюхина А.И. Образовательная среда высшего учебного заведения как педагогический феномен. Автореферат – Волгоград, ВГПУ – 2007, 40 с., с. 13-14

1. Статья « Адукацыйная прастора, адукацыйны асяродак і адукацыйная задача: пытанні адпаведнасц і» Дапиро Т.П./ Т.П.Дапиро// педагогика и психология детства:современное состояние и перспективы развития: сб-к науч. ст. /ГрГУ им. Я.Купалы; ред. кол. С.А.Сергейко (гл.редактор) и др.; под науч.ред.В.Т.Чепикова: ГрГУ,2011.-с.257-263 (всего 315)